■ К@нтыненты

# НАФТАВЫ «МІНІМАЛІЗМ»

## «Чорнае золата» працягне гульню на паніжэнне?

**На мінулым тыдні сітуацыя на нафтавым рынку нагадвала ліха закручаны трылер. 18 і 21 студзеня кошт на «чорнае золата» маркі Brent апускаўся ніжэй за 28 долараў за бараль. Для параўнання: у 2014 годзе на піку нафта каштавала $114,99 за бараль, а летась — $68,4.**




Кошт нафтавага кошыка Арганізацыі краін-экспарцёраў нафты (АПЕК) зменшыўся да $24,74 за бочку. Як паведаміла агенцтва Rambler News Service, гэта мінімальнае значэнне з мая 2003 года, калі за бараль АПЕК давалі 24,44 долара. Як вядома, у кошык уваходзяць 12 гатункаў «чорнага золата», сярод якіх Saharan Blend (Алжыр), Iran Heavy (Іран), Basra Light (Ірак), Kuwait Export (Кувейт), Arab Light (Саудаўская Аравія), Merey (Венесуэла).

Нафта таннела пад уплывам некалькіх фактараў. Ціск на кошт вуглевадародаў аказвае перавышэнне прапановы над попытам, запаволенне росту эканомікі Кітая (краіна з'яўляецца адным з найбуйнейшых спажыўцоў энерганосьбітаў у свеце) і здыманне санкцый з Ірана. Увогуле Ісламская Рэспубліка плануе павялічыць здабычу на мільён бараляў у дзень і пачаць інтэнсіўны экспарт.

Трэнд на паніжэнне быў даволі ўстойлівым, але ў пятніцу 22 студзеня нафта нечакана паказала найбольшы працэнтны рост са жніўня мінулага года. За адну гандлёвую сесію кошт павялічыўся на 10,02 працэнта — з 29,7 да 32,18 долара за бараль. Учора рост прадоўжыўся. Чаго чакаць далей?

### Агульны расклад

Кошт нафты змяншаўся пад уплывам шэрагу важных інфармацыйных паведамленняў. Міжнародны валютны фонд (МВФ) панізіў прагноз росту сусветнага ВУП на 2016 і 2017 гады на 0,2 працэнтнага пункта — да 3,4% і 3,6% адпаведна, вынікае з абноўленага агляду фонду World Economic Outlook. «Глабальны рост слабы і нераўнамерны з-за рызык, якія развіваюцца на рынках», — тлумачаць змену прагнозу аналітыкі фонду. Сярод іх ключавая пагроза — «запаволенне эканомікі Кітая», а таксама «ўмацаванне долара і напружанае геапалітычнае становішча».

«Бягучы год будзе перыядам сур'ёзных праблем, і ўплывовыя палітыкі павінны думаць не пра кароткатэрміновыя спосабы, якімі яны могуць падтрымаць эканоміку, а пра ўнёсак у доўгатэрміновыя перспектывы росту», — заўважыў дырэктар па даследаваннях і эканамічны кансультант МВФ Морыс Обстфельд.

З аднаго боку, паводле звестак фонду, працягваецца аднаўленне ў краінах з развітой эканомікай, якія будуць расці па 2,1% у 2016-2017 гадах (на 0,1 працэнтнага пункта павольней, чым прагназавалася летась у кастрычніку). Так, прагноз па росце ВУП еўразоны на 2016 год палепшаны на 0,1 працэнтнага пункта — да 1,7%, такі ж рост чакаецца і налета. Аналітыкі тлумачаць гэта тым, што ў ЕС расце асабістае спажыванне і фінансавы дабрабыт, што падтрымліваецца ніжэйшымі цэнамі на нафту і пераважае скарачэнне чыстага экспарту.

Прагноз эканомікі ЗША на бягучы і наступны год пагоршаны на 0,2 працэнтнага пункта — ВУП будзе расці па 2,6%. Фонд падкрэслівае, што ўмацаванне долара — адна з галоўных рызык не толькі ўласна Злучаных Штатаў, але і ўсёй глабальнай эканомікі.

З іншага боку, у краінах у стадыі развіцця, якія фарміруюць істотную долю сусветнага ВУП, прагназуецца зніжэнне актыўнасці шосты год запар. Агульны прагноз для іх пагоршаны на 0,2 працэнтнага пункта — да росту 4,3% і 4,7% у 2016 і 2017 годзе адпаведна.

Прагноз ВУП Расіі перагледжаны на бягучы год у бок змяншэння на 0,4 працэнтнага пункта — да падзення на 1%. Прагноз на 2017 год ранейшы. Фонд чакае, што расійская эканоміка выйдзе з крутога піке і пачне расці на 1%. Прагноз па Кітаі фонд пакінуў на кастрычніцкім узроўні — у бягучым і наступным годзе эканоміка КНР вырасце на 6,3% і 6% адпаведна. Сур'ёзна зніжаны і прагноз ВУП Саудаўскай Аравіі — найбуйнейшага сусветнага пастаўшчыка нафты. МВФ чакае рост яе эканомікі ў 2016 на 1,2% і ў 2017 годзе на 1,9%. Гэта на 1 працэнтны пункт ніжэй за кастрычніцкі прагноз.

У сваю чаргу, Міжнароднае энергетычнае агенцтва заявіла, што не выключае далейшага зніжэння сусветных цэн на нафту на фоне захавання ў 2016 годзе перавышэння прапановы над попытам. Агенцтва чакае, што трэці год запар прапанова будзе перавышаць попыт на 1 мільён бараляў у дзень.

АПЕК таксама абвясціла свой варыянт прагнозу. Па разліках экспертаў картэля, агульны сусветны попыт на нафту сёлета вырасце на 1,26 млн бараляў, дасягнуўшы ўзроўню 94,17 млн бараляў у суткі. Гэта прыкладна на 40 тыс. бараляў больш, чым чакалася раней. Прычым цягам года сусветны попыт будзе павялічвацца — з 93,3 млн бараляў у першым квартале да 95,17 млн у чацвёртым.

Эксперты АПЕК чакаюць таксама, што здабыча нафты ў краінах, якія не ўваходзяць у картэль, сёлета скароціцца прыкладна на 660 тыс. бараляў суткі (з 56,87 да 56,21 млн), галоўным чынам за кошт змяншэння аб'ёмаў здабычы ў ЗША і Канадзе.

### Страты і набыткі

Як заўважаюць эксперты, у нафтавай індустрыі назіраецца найглыбейшы за апошнюю чвэрць стагоддзя спад цэн. Урады нафтаздабыўных краін, якія разлічвалі на высокія сыравінныя прыбыткі, скарачаюць бюджэты, а імпарцёры падлічваюць выгаду. Увогуле танная нафта, па падліках эканамістаў МВФ, павялічыць глабальны ВУП на 0,2 працэнта, аднак для некаторых краін наступствы могуць быць сапраўды катастрафічнымі.

Раней падчас падобных крызісаў экспарцёрам удавалася сумеснымі намаганнямі спыніць зніжэнне кацыровак — праз абмежаванне здабычы. Праўда, адбывалася гэта галоўным чынам за кошт Саудаўскай Аравіі, якая выконвала квоты на здабычу. Цяпер Эр-Рыяд — галоўны голас у Арганізацыі краін-экспарцёраў нафты — адмовіўся дапамагаць сыравіннаму картэлю за свой кошт. У каралеўстве вырашылі трымацца да канца, каб у выніку зніжэння здабычы не страціць долю рынку, як гэта здаралася раней. Аднак цэны зваліліся да ўзроўню, якога і ў Саудаўскай Аравіі, мяркуючы па ўсім, не чакалі. Кацыроўкі ў памеры менш за 30 долараў за бараль не могуць не турбаваць нават арабаў, у якіх вельмі нізкі сабекошт здабычы — каля $10.

Спад цэн прымусіў каралеўства скараціць рэзервы на $90 млрд — да 650 млрд долараў. Таксама ўлады прыцягнулі больш $26 млрд на пазыковым рынку. Па выніках гэтага года дэфіцыт бюджэту Саудаўскай Аравіі дасягне 20% ВУП, прагназуе МВФ. З падобнымі цяжкасцямі стукнуліся таксама Катар, Кувейт і Аман (іх бюджэтны дэфіцыт — ад 5 да 8% ВУП).

КНР — буйны імпарцёр нафты. З аднаго боку, зніжэнне цэн дазволіць Кітаю менш выдаткоўваць на сыравіну. Летась Пекін заплаціў за імпартную нафту каля 228 млрд долараў, сёлета сума складзе $130-142 млрд. З іншага боку, Кітай таксама здабывае сыравіну. Па гэтым паказчыку краіна займае чацвёртае месца ў свеце пасля Саудаўскай Аравіі, Расіі і ЗША.

Для ЗША ўвогуле наступствы абвалу цэн на сыравіну станоўчыя — Амерыка ўсё яшчэ чысты імпарцёр нафты. Па падліках агенцтва Блумберг, для гэтай краіны спад цэн на нафту раўнацэнны падатковай зніжцы ў памеры $180 млрд у год.

### Бонус для Старога Свету

Еўрасаюз — найбуйнейшы імпарцёр нафты ў свеце: стабільныя пастаўкі сыравіны жыццёва неабходны для развіцця еўрапейскай эканомікі. Самая высокая доля закупак «чорнага золата» ў адносінах да ВУП у гэтым рэгіёне — у Літве і Балгарыі (больш 9%). Адзіны чысты экспарцёр сыравіны ў ЕС — Данія. Найбуйнейшы вытворца — Вялікабрытанія (пры гэтым Злучанае Каралеўства з'яўляецца чыстым імпарцёрам, бо спажывае ўсю сваю нафту і яшчэ закупляе за мяжой).

Цяперашнія цэны на нафту дапамогуць павялічыць аб'ём інвестыцый, колькасць працоўных месцаў і, як вынік, паскорыць эканоміку. Чакаецца, што дзякуючы нізкім цэнам на нафту ў Еўрасаюзе будуць створаны 3 мільёны новых працоўных месцаў.

Ацэньваючы наступствы абвалу сыравінных катыровак для Еўропы, нельга абысці ўвагай Нарвегію, для якой нафта з'яўляецца галоўным прадуктам экспарту. Нягледзячы на павелічэнне здабычы на 10%, нафтавыя прыбыткі краіны скараціліся да мінімуму з 2009 года. Сёлетні дэфіцыт бюджэту Нарвегіі складзе каля $25 млрд.

Выхад на рынак іранскай нафты — дрэнная навіна для іншых нафтаэкспарцёраў і перш за ўсё для Расіі і Саудаўскай Аравіі. Справа у тым, што калі санкцыі ўводзіліся, менавіта гэтыя краіны занялі месца Ірана на рынках збыту, у тым ліку ў Еўропе. У выніку аб'ём неатрыманых Ісламскай Рэспублікай прыбыткаў ад экспарту нафты склаў больш 160 мільярдаў долараў. Цяпер, калі санкцыі зняты, краіна зможа аднавіць продаж сваёй нафты на міжнародным рынку. Іран валодае чацвёртымі па маштабах запасамі нафты ў свеце пасля ЗША, Саудаўскай Аравіі і Расіі. Пры гэтым іранская нафтаздабыўная прамысловасць гатова да змяншэння цэн. Тэгеран паспрабуе ўзяць рэванш і зноў заняць страчаныя пазіцыі.

Гульня на паніжэнне працягваецца. Іран ужо зменшыў цэны на «чорнае золата» для спажыўцоў у Еўропе, каб канкураваць на гэтым рынку з Саудаўскай Аравіяй. Кошт нафты гатунку Iran Heavy са зніжкай (6,55 долара) будзе роўны $17,3 за бараль. Саудаўская Аравія прадае сваю нафту з дысконтам у 4,85 долара за бараль.

Як лічаць аналітыкі рынку, перыяд росту цэн на «чорнае золата» працягнецца нядоўга. А наконт далейшых перспектыў лепш за ўсіх выказаўся кіраўнік аддзела па інвестыцыях Ayers Alliance Securities Джонатан Барэт: «Цэны на нафту знаходзяцца на ўзроўні, на якім змагаюцца ўсе краіны АПЕК. Яна прадаецца цяпер дзеля руху грашовага патоку, а не прыбытку». Так што эпоха нафтавага «мінімалізму», напэўна, працягнецца.

**Захар БУРАК.** *burak@zviazda.by*


**БЕЛАРУСБАНК**

ОАО «АСБ Беларусбанк» информирует, что с 01.02.2016 по действующим текущим счетам, доступ к которым может быть обеспечен при использовании дебетовой банковской платежной карточки, по которым проценты начисляются в размере ставки по банковскому вкладу «Пенсионный» (далее – Пенсионные текущие счета), а также по действующим текущим счетам в рамках пакета услуг «Пенсионный», установлена процентная ставка в размере 0,5% годовых.

Одновременно информируем об отмене с 01.02.2016 начисления и выплаты дополнительного процентного дохода, установленного решением Правления ОАО «АСБ Беларусбанк» от 18.06.2009 (протокол №69.11), по открытым до 01.02.2016 Пенсионным текущим счетам.

**Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте и в отделениях «Беларусбанка»**

Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 24.05.2013, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.



**ОАО «СТРОИТЕЛЬНЫЙ ТРЕСТ №8»**

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА**

| Номер лота | Предмет торгов | Начальная цена, бел. руб. без учета НДС | Размер задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| Лот №1 | Объект недвижимости: Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-122236, площадью 153,2 кв.м (назначение: административное помещение, наименование: изолированное помещение), находящееся в капитальном строении с инвентарным номером 100/С-38868, расположенном на земельном участке с кадастровым номером 140100000001003204, площадью 0,9603 га | 1 244 569 600 | 124 456 960 |
| Местонахождение объекта | г. Брест, ул. Гродненская, 47/1 | | |
| Характеристики земельного участка | Земельный участок выделен продавцу на праве постоянного пользования | | |
| Условия продажи | Без условий | | |
| Продавец (Балансодержатель) | ОАО «Строительный трест №8» | | |
| Организатор торгов | ОАО «Строительный трест №8» | | |
| Срок заключения договора купли-продажи | В течение 10-ти рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона | | |
| Шаг аукциона | 5% от начальной цены лота | | |
| Условия оплаты | В соответствии с заключенным договором купли-продажи | | |
| Номер р/с для перечисления задатка | р/с 3012121884440 в Региональной Дирекции № 100 ОАО «БПС-Сбербанк», код 153001369, получатель платежа – ОАО «Строительный трест №8» | | |

**Аукцион состоится 05 февраля 2016 г. в 11.00 по адресу: 224013, г. Брест, б-р Шевченко, 4, зал заседаний ОАО «Строительный трест №8», каб. 230, 231.**

Для участия в аукционе необходимо предоставить:

1. Заявление на участие в аукционе по установленной форме и подписанное соглашение о правах и обязанностях с ОАО «Строительный трест №8».
2. Заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка на расчетный счет организатора торгов.
3. Юридическим лицам – резидентам Республики Беларусь – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица; представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
4. Юридическим лицам – нерезидентам Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписку из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена не ранее чем за 6 месяцев до даты подачи заявления на участие в аукционе); представителю юридического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
5. Индивидуальным предпринимателям – копию документа, подтверждающего государственную регистрацию; представителю индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица).
6. Физическим лицам – представителю физического лица – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность данного представителя.
7. При подаче документов на участие в аукционе физические лица, представители физических и юридических лиц, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: 224013, г. Брест, б-р Шевченко, 4, каб. 418 в рабочие дни с 8.30 до 17.30.**

**Последний день приема заявлений – 05 февраля 2016 г. до 10.00.**

**Контактный телефон организатора аукционных торгов: 8-(0162)-22-01-72.**